КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 35 (1682) | 30 жніўня 2024 г.

Фота
Уладзіміра ШЛАПАКА

Задачы на новы навучальны год і ўзнагароды найлепшым настаўнікам: у сталіцы праходзіць жнівеньскі форум педагагічных работнікаў у сферы культуры. Падзея сабрала адмыслоўцаў з усёй краіны.

Працяг тэмы на стар. 2

9 771994 478007 24035

Якасная адукацыя — моцная дзяржава

Вялікая размова аб стане і перспектывах развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі адбылася напярэдадні навучальнага года ў Мінску. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 жніўня паўдзельнічаў у Рэспубліканскім педагагічным савеце.

Форум сабраў у Палацы Рэспублікі больш за 2,5 тысячы педагогаў, кіраўнікоў устаноў адукацыі, рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў. Сярод запрошаных былі таксама парламентарыі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі.

Абмяркоўваліся стратэгічныя пытанні развіцця галіны, гатоўнасць школ, новыя падручнікі, планы па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, узаемадзеянне ВНУ з заказчыкамі кадраў.

Быў заслуханы даклад профільнага міністра Андрэя Іванца. На педсавеце таксама выступілі кіраўнікі ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню: гімназіі Барысаўскага раёна, Мінскага дзяржаўнага каледжа інавацыйных будаўнічых тэхналогій, Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў. Гаварылі пра павышэнне якасці адукацыі, удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў, узаемадзеянне ВНУ з заказчыкамі кадраў, ідэалагічны складнік выхавання.

Аляксандр Лукашэнка дэталёва цікавіўся дакладамі, задаваў выступоўцам удакладняльныя пытанні, а часам і сам выказваўся па актуальных тэмах.

Па словах Кіраўніка дзяржавы, адукацыя рэфармавалася шмат гадоў запар. У гэтым напрамку, лічыць Прэзідэнт, шмат чаго зроблена. Таму істотных змяненняў у сістэме адукацыі не чакаецца. Але там, дзе патрэбна, будзе “дашліфоўка”. Аляксандр Лукашэнка абазначыў ключавыя напрамкі, па якіх належыць праводзіць данастройку. Аднак пры ўсіх інавацыях нязменным павінен застацца базавы падыход — абавязкова роўны доступ да адукацыі.

— Гэта — святое! — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка пераканаены, што без уздыму аўтарытэту настаўніка няма чаго гаварыць аб эфектыўнасці адукацыі. Школа — храм, настаўнік — святы чалавек. Кіраўнік дзяржавы заклікаў да фарміравання такога стаўлення ў грамадстве і звярнуў увагу: перш за ўсё тэтага павінны захацець самі педагогі.

— А мы павінны аказаць усялякую падтрымку, — запэўніў лідар. — Настаўнік — гэта чалавек Прэзідэнта.

Ён канстатаваў, што прэстыж любой прафесіі мяркуе і дастойны заработак.

— Па зарплатах мы ўпершыню ў гісторыі наблізіліся да сярэдняй па краіне. Тут арыфметыка простая: вы рыхтуеце канкурэнтаздольных спецыялістаў, эканоміка расце — растуць вашы даходы, — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка назваў патрыятызм фундаментам адукацыі.

— Зроблена нямала. Мы можам гаварыць аб канкрэтных выніках: фіксуем высокія конкурсы на ваенныя спецыяльнасці, бачым, як расце цікавасць моладзі да пошукавай работы, студатрадаўскага руху і як зніжаецца колькасць выпускнікоў школ, якія едуць вучыцца за мяжу, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Работу трэба прадаўжаць. І трэба памятаць: патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт.

Як мяркуе беларускі лідар, таленты павінны заставацца ў нашай краіне, а работу са здольнымі дзецьмі ў школах і ВНУ неабходна ўзмацніць. Мэта адна: гэтыя хлопцы і дзяўчаты павінны жыць і працаваць у сваёй краіне.

— У Беларусі ў наступнай пяцігодцы створым адукацыйны хаб сусветнага ўзору, не горшы за Гарвард, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Напрыклад, на базе аднаго з факультэтаў БДУ пабудуем самы сучасны кампус і арганізуем па поўным фабрычным цыкле вышэйшую школу па якой-небудзь спецыяльнасці, па іншых напрамках і сткак далей.

Гаворачы аб прафесіях заўтрашняга дня, Кіраўнік дзяржавы адзначыў слабую работу над развіццём спецыяльнасцей, якія знаходзяцца на стыку некалькіх дысцыплін. Гэта, напрыклад, тэлямедыцына, агракібернетыка, біяхакінг.

— Але штучны інтэлект не заменіць вас — жывога настаўніка. Асабліва ў выхаванні навыкаў адаптыўнасці і нацэленасці на будучыню, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

ПАД УВАГАЙ ПЕРШАГА

Сведка пяці вякоў

Славутая царква-крэпасць Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Мураванцы сёлета адзначае 500-годдзе. Круглую дату святыня сустракае адрэстаўраванай. На маштабныя работы былі выдаткаваны сродкі з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва. І гэта чарговае пацвярджэнне таго, што захаванне спадчыны — адзін з прыярытэтаў нашай дзяржавы.

Вядомы храм узвялі ў XVI стагоддзі. Ён быў праваслаўным, уніяцкім, каталіцкім, перажыў заняпад і ў рэшце рэшт дачакаўся перыяду духоўнага адраджэння. Выдатны архітэктурны помнік спалучае элементы познегатычнага стылю і рэнесансныя рысы. Магутныя сцены, акенцы-байніцы, круглыя вежы з вітымі лесвіцамі — у розныя часы будынак служыў не толькі месцам малітвы, але і непрыступным абаронцам.

Хоць царква пераадолела мноства гістарычных выпрабаванняў, да нашых дзён яна дайшла ў выглядзе, вельмі блізкім да аўтэнтычнага. Аднак час не шкадуе ніводны архітэктурны шэдэўр. Дзякуючы апецы дзяржавы на ўнікальным аб'екце праведзены патрэбныя працы. З фонду Прэзідэнта было накіравана 500 тысяч рублёў.

Адмыслоўцы замянілі каля 500 разбураных фрагментаў арыгінальнай цэглы, ачысцілі фасады ад моху і забруджванняў ды апрацавалі муры ўмацавальнымі саставамі. Акрамя таго, цалкам была перароблена вадасцёкавая сістэма, звонку — нанесена свежая тынкоўка і фарба. Паралельна спецыялісты адрамантавалі праблемныя ўчасткі даху. Мяркуецца, што падчас другой чаргі прац будзе абноўлены ўнутраны выгляд царквы.

Найлепшыя — на сцэну!

Сёння, 30 жніўня, у Мінску праходзіць традыцыйны жнівеньскі форум педагагічных работнікаў нашай сферы. Арганізатарам выступае Міністэрства культуры Беларусі.

Пляцоўкай для мерапрыемства стаў спартыўна-культурны цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. На форум прыбылі кіраўнікі і выкладчыкі ўстаноў адукацыі нашай галіны, ветэраны педагагічнай працы, начальнікі ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Да ўдзелу запрошаны маладыя спецыялісты з розных рэгіёнаў Беларусі.

Трохступеньчатая сістэма адукацыі ў сферы культуры, якая склалася ў нашай краіне, дае плён. Штогод пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў становяцца дзясяткі юных творцаў. Рэгулярна папаўняюцца банкі даных адоранай і таленавітай моладзі, новыя імёны з'яўляюцца ў спісах на заахвочванне спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

І недарма ключавы момант форуму педагагічных работнікаў — цырымонія ўшанавання найлепшых. Узнагароды рознага ўзроўню ўручаюцца кіраўнікам устаноў адукацыі, педагогам і творчым калектывам за высокія прафесійныя вынікі і адданасць справе. Асобная ўвага — маладым спецыялістам, якія толькі прыбылі на першыя працоўныя месцы. Сярод іх і адмыслоўцы ўстановы “Культура і мастацтва”.

Таксама ў праграме ўрачыстасцей — канцэрт з удзелам маладых вакалістаў, танцораў, музыкантаў з усёй краіны і мастацкая выстава. Падрабязнасці — у наступным нумары.

Культурная дыпламатыя

Новыя кантакты і пагадненні аб супрацоўніцтве: з 26 па 28 жніўня Ташкент прымаў Узбекска-беларускі жаночы бізнес-форум.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і Старшыня Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзіла Нарбаева

Гэта другая сустрэча ў падобным фармаце, арганізатарамі якой выступаюць Сенат Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Ад беларускага боку ў форуме ўдзельнічала амаль 100 прадстаўнікоў бізнес-супольнасці і дзяржаўных органаў на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай.

У склад дэлегацыі ад сферы культуры ўвайшлі генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Кацярына Дулава, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр Храмой і прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Корсакава.

У рамках форуму правялі пленарнае пасяджэнне, тэматычныя секцыі па асноўных напрамках супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана. Галоўная мэта заключалася ў тым, каб прадэманстраваць наш патэнцыял, зацікавіць ва ўстанаўленні новых кантактаў.

Падчас афіцыйных мерапрыемстваў былі падпісаны камерцыйныя кантракты, а таксама пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі і Дзяржаўным музеем гісторыі Узбекістана, Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Беларусі і Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатрам Узбекістана.

Падчас фестывалю "Шарк тароналары"

Унікальнай пляцоўкай для культурнага дыялогу стаў фестываль “Шарк тароналары” ў Самаркандзе. З 1997 года “Мелодыі Усходу” аб'ядноўваюць прадстаўнікоў розных відаў мастацтва з многіх дзяржаў. Сёлета гэтая грандыёзная музычная падзея сабрала больш за 300 творцаў з 80 краін — ад Беларусі да Японіі. Мерапрыемства праводзіцца пры падтрымцы UNESCO і пад патранатам Прэзідэнта Узбекістана — Шаўкат Мірзіёеў адкрыў 13-ы фестываль “Шарк тароналары”. У цырымоніі паўдзельнічала і беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай.

Часткай форуму была навукова-практычная канферэнцыя “Музычная культура Усходняй Азіі: прынцыпы творчай інтэграцыі ў працэсе глабалізацыі”, якая аб'яднала адмыслоўцаў з больш як 80 краін. Нашу дзяржаву прадставіў Аляксандр Бабук, намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуцы і інфармацыйных тэхналогіях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Падарункі — глебаўцам

Дзень ведаў навучэнцы Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава сустрэнуць у новым будынку. Урачыстае адкрыццё комплексу па вуліцы Б. Хмяльніцкага, 5, адбудзецца 2 верасня.

Мастацкі каледж імя А. К. Глебава вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. У сценах легендарнай навучальнай установы вырасла не адно пакаленне сапраўдных майстроў. Сярод першых выпускнікоў Глебаўкі — народныя мастакі Беларусі Міхаіл Савіцкі, Віктар Грамыка, Май Данцыг, Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі, Васіль Шаранговіч, Леанід Шчамялёў.

У 2010-м прызнаны аварыйным стары корпус каледжа знеслі і пачалі ўзводзіць сучасны кампус. Аднак аб'ект ператварыўся ў даўгабуд. Толькі вясной 2022-га працы на пляцоўцы працягнуліся і ўсяго за два гады былі завершаны. Цяпер комплекс уводзіцца ў эксплуатацыю.

Кампус складаецца з навучальнага корпуса і інтэрната. Усё абсталявана ў адпаведнасці з найноўшымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу. Камфартабельныя ўмовы дазволяць педагогам і іх апекаванцам поўнасцю прысвяціць сябе любімай справе.

Павіншаваць калектыў каледжа з Днём ведаў і наваселлем збяруцца пачэсныя госці. Творчыя падарункі рыхтуюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж ды іншыя.

Заключным акордам свята стане прэм'ера песні: у выкананні

народных артыстаў Беларусі Уладзіміра Громава і Настассі Масквіной прагучыць ода “Табе, мастацтва” (музыка А. Атрашкевіч, словы В. Жуковіча). Кампазіцыя напісана спецыяльна ў гонар адкрыцця новага будынка Мінскага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава.

На карысць!

Якой павінна быць галіновая газета? Журналісты “К” правялі анкетаванне, каб даследаваць чытацкую аўдыторыю.

Нашымі рэспандэнтамі сталі супрацоўнікі Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, Музея гісторыі горада Гомеля і іншых устаноў культуры гарадскога і абласнога падпарадкавання. Удзельнікі анкетавання адказалі на адкрытыя і закрытыя пытанні наконт інфармаванасці аб рабоце рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва”, задаволенасці афармленнем газеты, якасцю і тэматыкай публікацый.

У выніку даследавання высветлілася, што большасць рэспандэнтаў прывяўваюць асобныя рубрыкі, звязаныя са сферай прафесійнай дзейнасці. Але каля 20 % — адданыя падпісчыкі, якія чытаюць газету ад першага да апошняга радка.

Што да формы выкладу матэрыялу, апытаныя лічаць самымі захапляльнымі публікацыі ў жанры інтэрв'ю, а таксама рэпартажы з мерапрыемстваў і інфармацыйныя нататкі: многія рэспандэнты хочуць быць у курсе апошніх падзей. Крыху меншай папулярнасцю карыстаюцца замалёўкі і аналітычныя артыкулы.

Адзначым, што каля 70 % чытачоў газеты цікавіцца тэатральным жыццём краіны, асаблівасцямі функцыянавання музеяў і пытаннямі захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Крыху менш запатрабаваны артыкулы, прысвечаныя музычнаму мастацтву і дзейнасці ўстаноў адукацыі, народным традыцыям і абрадам. Таксама падпісчыкі выступаюць за шырэйшае асвятленне працы бібліятэк, палацаў і цэнтраў культуры.

Удзельнікі анкетавання ў асноўным ведаюць пра існаванне афіцыйнага сайта выдання, але аддаюць перавагу друкаванай версіі. Большасць чытачоў лічыць цяперашні аб'ём газеты дастатковым, а ілюстрацыі — дарэчнымі і якаснымі.

Калектыў рэдакцыі шчыра дзякуе кожнаму, хто далучыўся да апытання. Разам мы зробім “Культуру” больш карыснай і цікавай!

Падчас пасяджэння калегіі

На варце памяці

Прыцягненне наведвальнікаў, праца з фондамі, рэстаўрацыя і брэндавыя мерапрыемствы. Аб праблемах і перспектывах музейнай сферы гаварылі на чарговым пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры.

Асноўны паказчык для музеяў па дзяржпраграме "Культура Беларусі" — колькасць наведванняў на тысячу чалавек. Летась ён быў перавыкананы. Вырасла і доля пазабюджэтных даходаў у агульным аб'ёме фінансавання.

Адкрываючы сход, першы намеснік міністра **Валерый Грамада** сказаў: у цэлым дзяржаўныя музеі дэманструюць станоўчую дынаміку фінансава-эканамічнай дзейнасці. Напрыклад, мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" за першае паўгоддзе значна перавыканаў паказчыкі. Установу наведала каля 350 тысяч чалавек. Сярод рэгіянальных арганізацый у лідарах мемарыяльны комплекс "Хатынь" і Гомельскі палацава-паркавы ансамбль.

Акрамя таго, па выніках працы за апошнія два гады на Рэспубліканскую дошку Гонару заносілі мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Гомельскі музей ваеннай славы. Вядучыя ўстановы дэманстравалі свае праекты на ВДНГ у Маскве ў рамках прэзентацыі культурнага патэнцыялу Беларусі.

Валерый Грамада звярнуў увагу, што дзяржава аказвае магутную падтрымку музеям. Прыкладам, на рэстаўрацыю Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея накіравана каля 36 мільёнаў рублёў, Косаўскага палацава-паркавага комплексу — больш за 35 мільёнаў рублёў. Разам з тым перад арганізацыямі стаіць задача павялічваць долю ўласных даходаў. Таксама актуальнае кадравае пытанне: у музейнай сферы патрэба ў супрацоўніках большая, чым у сярэднім у галіне культуры. Асабліва востра гэтая праблема адчуваецца на Гомельшчыне і ў Мінску.

Жыліцкі гістарычны комплекс-музей

АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ПЛАНЫ

— Сучасным беларускім музеям удаецца падтрымліваць баланс паміж захаваннем традыцый і імкненнем да інавацый. Установы ідуць у нагу з часам, не здраджваючы прызначэнню. Гэта дазваляе зберагаць кантакт з людзьмі і прыцягваць маладую аўдыторыю, — падкрэсліла ў сваім дакладзе начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры **Ірына Карповіч**.

Асноўны паказчык у музейнай справе, устаноўлены Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2021—2025 гады, — колькасць наведванняў на тысячу чалавек насельніцтва. Летась ён быў перавыкананы: 829 наведванняў на тысячу чалавек. Другі мэтавы паказчык — доля алічбаваных музейных прадметаў. Калі ў 2020-м яна складала толькі 9 %, то па выніках мінулага года — каля 25 %. Разам з тым калегія пастанавіла да канца 2024-га распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па алічбоўцы прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь.

УЛАСНЫ ЗАРОБАК

Летась вырасла доля пазабюджэтных даходаў у агульным аб'ёме фінансавання. Лідары па зароблены сродках — Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж", музей "Замкавы комплекс «Мір»" і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Найбольшы пазабюджэтны даход сярод рэгіянальных устаноў атрымалі Косаўскі палацава-паркавы комплекс, музей "Бездзежскі фартушок", Музей Марка Шагала ў Віцебску, Карцінная галерэя Г. Х. Вашчанкі ў Гомелі, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Лідскі гісторыка-мастацкі музей, Музей-сядзіба М. К. Агінскага ў Залессі і Жыліцкі гістарычны комплекс-музей.

Заваяваць аўдыторыю розных катэгорый дапамагаюць брэндавыя мерапрыемствы. Прыкладам, у Нясвіжы да славутых "Вечароў Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў" дадаліся праекты "Джаз у горадзе Н.", "Нясвіж Хрыстоў запрашае", "Вяртанне да тэатральных вытокаў". Яны ўжо сталі традыцыйнымі. Афішу ў Мірскім замку дапоўнілі выступленні Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, канцэрты Лаўрэатаў Рэспубліканскага адкрытага фестывалю-конкурсу класічнай музыкі "Музычны Мір". Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту штосуботу запрашае на абрадавыя імпрэзы.

Каб прыцягнуць наведвальнікаў, скарбніцы прымяняюць новыя формы працы, ладзяць інтэрактыўныя заняткі, ствараюць студыі па інтарэсах. Варта згадаць і акцыю "Ніхто не забыты. Нішто не забыта", у межах якой можна бясплатна наведаць усе музеі рэспублікі 9 мая. Адмысловы дзень бясплатнага візіту ўстаноўлены і для школьнікаў. Такая магчымасць з'явілася ў новага пакалення дзякуючы пагадненню паміж Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі.

Эфектыўнасць паказалі і анлайн-трансляцыі выстаў ды віртуальныя экскурсіі.

Ірына Карповіч, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры:

— Ад нас з вамі залежыць захаванне гістарычнай праўды, пра якую так шмат кажуць апошнім часам. Менавіта мы тыя людзі, што вывучаюць, зберагаюць, транслююць і пішуць гісторыю нашай дзяржавы.

Фрагмент экспазіцыі "80 рэліквій Вялікай Айчыннай вайны"

У залах Нацыянальнага мастацкага музея

Для замежных турыстаў укараняюць аўдыягіды на англійскай, нямецкай, кітайскай і іншых мовах. Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць і ў тым, каб зрабіць культурныя паслугі больш даступнымі для людзей з інваліднасцю.

БАЛЮЧЫЯ КРОПКІ

Асаблівай увагі патрабуе праца з фондамі. Улік музейных прадметаў ажыццяўляецца з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы, праз якую вядзецца электронны каталог. На пачатак гэтага года ў яго было ўнесена больш за тры чвэрці ўсяго музейнага фонду краіны. Аднак не кожная ўстанова трымаецца належнага тэмпу работы.

Як адзначыла Ірына Карповіч, актуальным застаецца пытанне кансервацыі і рэстаўрацыі музейных аб'ектаў. У сувязі з гэтым калегія вырашыла да пачатку снежня распрацаваць план рэстаўрацыйных работ для прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, на 2025—2027 гады.

Таксама на кантролі ведамства — праблема недакладнай і скажонай падачы гістарычных фактаў у экспазіцыйных прасторах. Такія выпадкі выяўлены ў некаторых рэгіянальных музеях, у тым ліку дзякуючы зваротам грамадзян. З гэтай прычыны варта ўдзяліць асаблівую ўвагу супрацоўнікам, якія ўзаемадзейнічаюць з наведвальнікамі, і правесці іх дадатковае навучанне і атэстацыю.

156 музеяў зарэгістравана ў дзяржаўным рэестры.

≈ 4,7 млн чалавек наведала гэтыя ўстановы за першае паўгоддзе 2024-га.

≈ 81 тыс. экскурсій праведзена ў музеях за першае паўгоддзе 2024-га.

Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава

Згодна з ранейшым пастаўленнем калегіі Міністэрства культуры, арганізавана 105 экспазіцый, прысвечаных развіццю Беларусі ў другой палове XX — XXI стагоддзі. Яшчэ 26 рыхтуюцца да адкрыцця сёлета. Таксама апошнім часам разам з Генеральнай пракуратурай вялася мэтанакіраваная праца па стварэнні экспазіцый аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аднак некаторыя рэгіёны адстаюць у гэтай справе.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея **Ганна Конанава** паведаміла аб арганізацыі работы рэспубліканскага рэстаўрацыйнага цэнтра на базе ўстановы. Аддзел навукова-рэстаўрацыйных майстэрняў ажыццяўляе рэстаўрацыю і кансервацыю алейнага і тэмпернага жывапісу, паліхромнай скульптуры, мэблі, металу і керамікі, тканін, старадрукаваных кніг і графікі. Установа не толькі працуе з прадметамі з уласных фондаў, але і аказвае паслугі іншым арганізацыям і фізічным асобам. Высокі прафесіяналізм работнікаў і магутная матэрыяльна-тэхнічная база дазваляюць выдатна спраўляцца з самымі складанымі задачамі. Сярод заказчыкаў — музей "Замкавы комплекс «Мір»" і іншыя скарбніцы нашай краіны.

ВОПЫТ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

Аб дзейнасці па развіцці музейнай справы ў рэгіёне расказаў дырэктар Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е. Р. Раманава **Віктар Анненкаў**. Установа наладзіла сістэму куратарства. Такім чынам, за кожным раённым музеем замацаваны вопытны спецыяліст. Працуюць і мабільныя групы, якія выязджаюць у розныя куткі Магілёўшчыны, каб выявіць праблемныя пытанні і дапамагчы ў іх рашэнні.

Як падкрэсліў Віктар Мікалаевіч, важная форма павышэння кваліфікацыі — семінары-практыкумы. Апошнім часам абласны краязнаўчы музей зладзіў заняткі, прысвечаныя ўліку, захаванню, алічбоўцы і ацэнцы музейных прадметаў, адлюстраванню генацыду беларускага народа ў экспазіцыях, методыцы правядзення экскурсій, іншым тэмам.

Музейная сетка Магілёўшчыны прыраслa новымі знакавымі аб'ектамі. Сярод іх — Мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах, экспазіцыя ў мемарыяльным комплексе ў вёсцы Боркі, Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль, экспазіцыя аб гісторыі фестывалю "Александрыя збірае сяброў". Цяпер вядуцца працы над будучай экспазіцыяй Клімавіцкага раённага краязнаўчага музея, які размесціцца ў рэканструяваным асабняку — помніку драўлянага дойлідства XIX стагоддзя. Адмыслоўцы працягваюць шчываць і над Музеем Славы Магілёўшчыны на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу "Буйніцкае поле".

Ва ўсіх установах рэгіёна адкрыты раздзелы і выставы аб генацыдзе беларускага народа ў Вялікую Айчынную вайну. Пры іх стварэнні навуковыя супрацоўнікі актыўна карысталіся найноўшымі вынікамі расследавання Генеральнай пракуратуры. Таксама ўсе музеі Прыдняпроўскага краю прэзентавалі экспазіцыі "Беларусь XXI стагоддзя", што адлюстроўваюць станаўленне нашай дзяржаўнасці, сучасныя дасягненні ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, культуры, спорце і іншых сферах.

Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усе музеі вобласці аб'ядналі намаганні для стварэння праекта "80 рэліквій Вялікай Айчыннай вайны". Эксперты адабралі найбольш выбітныя прадметы для часовай экспазіцыі.

РАШЭННІ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Падчас пасяджэння калегіі Міністэрства культуры таксама выступілі іншыя прадстаўнікі дзяржаўных органаў, кіраўнікі рэспубліканскіх і рэгіянальных музеяў. Начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама **Пётр Падгурскі** распавёў пра выкананне сацыяльна-эканамічных і прагнозных паказчыкаў музеямі вобласці. Дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа **Ірына Мацяс** і дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы **Ганна Галінская** паведамілі аб мерах па павышэнні долі ўласных даходаў устаноў і павелічэнні заработнай платы.

Для ліквідацыі выяўленых парушэнняў, выканання сацыяльна-эканамічных і прагнозных паказчыкаў, а таксама для далейшага развіцця музеяў калегія Міністэрства культуры рашыла прыняць шэраг захадаў. Сярод іх — правядзенне рэспубліканскага навукова-практычнага семінара для галоўных захавальнікаў фондаў, стварэнне метадычных рэкамендацый.

Актывізаваць варта і міжнароднае супрацоўніцтва, у прыватнасці з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. За апошнія тры гады ўжо рэалізаваны цэлы шэраг знакавых выставачных праектаў, навуковых і дзелавых праграм. Таксама перад арганізацыямі пастаўлена задача забяспечыць рост пазабюджэтных даходаў не менш чым на 9 % да ўзроўню мінулага года, павысіць сярэднямесячны заробак супрацоўнікаў музеяў і аб'ём пазабюджэтных даходаў, што накіроўваюцца на стымулюючыя выплаты.

Даніл ШЭЙКА



На кантролі ў міністэрства

Напрыканцы жніўня па ўсёй краіне праходзяць планавыя праверкі гатоўнасці ўстаноў адукацыі да навучальнага года. Як падрыхтаваўся да сустрэчы са студэнтамі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў? У рэйд разам з прадстаўнікамі галіновага міністэрства выправілася "К".

Праверку ўзначаліў намеснік міністра культуры **Сяргей Саракач**. Падчас візіту ва ўстанову спецыялісты ведамства агледзелі навучальныя карпусы і інтэрнаты. Таксама ў поле зроку патрапіў спартыўна-культурны цэнтр і сталовая.

Члены камісіі звярталі ўвагу на агульны стан інфраструктуры, якасць рамонту і адпаведнасць тэхнічнага абсталявання ўніверсітэта сучасным патрабаванням. Асобна кантралявалася наяўнасць дзяржаўнай сімволікі ў аўдыторыях і адміністрацыйных памяшканнях.

— Выезд прадстаўнікоў міністэрства ў БДУКМ арганізаваны з мэтай маніторынгу гатоўнасці ўстановы да прыёму студэнтаў, — адзначыў Сяргей Аляксандравіч. — Па выніках праверкі навучальных памяшканняў, пакояў і кухань у інтэрнатах істотных нараканняў не было. Харчаблок таксама ў добрым санітарна-тэхнічным стане. Можна ўпэўнена сказаць, што ўніверсітэт падрыхтаваны да пачатку навучальнага года.

Намеснік міністра падкрэсліў важнасць своечасовага абнаўлення інфраструктуры — як на пазабюджэтныя сродкі ўстаноў культуры і адукацыі, так і за дзяржаўны кошт:

— З часам любыя аб'екты старэюць як фізічна, так і маральна. Таму Міністэрства культуры сістэматычна вылучае рэсурсы для мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы падведамных арганізацый. Сёлета выдзелены сродкі на новы святлодыёдны экран для ўніверсітэцкага спартыўна-культурнага цэнтра. Такое абсталяванне дазволіць праводзіць мерапрыемствы на больш высокім узроўні, запрашаць на іх выбітных гасцей, — сказаў Сяргей Саракач.

У рэйдзе паўдзельнічала і начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры **Марына Юркевіч**. Яна адзначыла, што прыёмка ўніверсітэта з'яўляецца планавай працэдурай і ажыццяўляецца згодна з усімі заканадаўчымі актамі:

— Міжведамасная праверка інфраструктуры адукацыйных устаноў у галіне культуры праводзіцца перад пачаткам навучальнага працэсу. На працягу некалькіх месяцаў універсітэты і каледжы рыхтуюцца да атэстацыі на адпаведнасць санітарным нормам, патрабаванням супрацьпажарнай бяспекі ды іншым. На дадзены момант усе ўстановы адукацыі ў сферы культуры прыняты і гатовы да новага навучальнага года, — распавяла Марына Браніславаўна.

Не сакрэт: за пазітыўным вынікам любой праверкі заўжды стаяць намаганні калектыву. Так, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце БДУКМ **Сяргей Жалязняк** распавёў аб шырокім фронце прац, выкананых у будынках універсітэта за апошнія месяцы:

— Падрыхтоўка да прыёму студэнтаў вялася сістэмна і па ўсіх напрамках. Быў значна абноўлены аўдыторны фонд: закуплены дзясяткі камплектаў вучнёўскай мэблі, абсталяваны дадатковыя камп'ютарныя класы. Заўважу, што больш за 70 аўдыторый адрамантавана ўласнымі сіламі ўніверсітэта. Актыўная праца ішла і ў інтэрнатах нашай установы. Так, у 40 жылых блоках зрабілі комплексны рамонт. Закуплена новая бытавая тэхніка. У адным з інтэрнатаў адкрылі санітарны блок. Парадак наведзены і на прылеглай да ўніверсітэта тэрыторыі. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы былі накіраваны ў тым ліку пазабюджэтныя сродкі, — расказаў Сяргей Жалязняк.

Сяргей Жалязняк, Сяргей Саракач і Марына Юркевіч падчас праверкі ў БДУКМ

Штотычыцца "К", то мы самі ўпэўніліся: універсітэт поўнасцю гатовы да навучальнага года. Студэнтам застаецца толькі набірацца ведаў і ўдзельнічаць у творчым жыцці ўстановы. У БДУКМ для гэтага ёсць усе ўмовы.

Даніл ПІЎКАРЭЦ
Фота аўтара

Разам — да адкрыцця

Перад суботнікам

Перад навучальным годам у новым будынку Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава кіпіць праца: да суботнікаў Міністэрства культуры далучыліся розныя арганізацыі галіны. Лічаныя дні застаюцца да афіцыйнага адкрыцця комплексу — і дапамога калег вельмі дарэчы.

Кіраўніцтва ведамства — у авангардзе працоўнага дэсанта, які прыбыў у кампус Глебаўкі 24 жніўня.

— З гэтай навучальнай установы выйшла цэлая плеяда знакамітых мастакоў і скульптараў. У каледжы шматгадовыя традыцыі падрыхтоўкі творчых кадраў, — адзначае першы намеснік міністра **Валерый Грамада**. — Адкрыццё новага комплексу павінна прыцягнуць не толькі таленавітую моладзь з усёй Беларусі, але і замежных студэнтаў. Працы на аб'екце знаходзіцца на асаблівым кантролі Міністэрства культуры. Будоўля вялася за кошт сродкаў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Прыемна, што прадстаўнікі ўстаноў культуры далучыліся да нашага суботніка. Такія мерапрыемствы даюць добрую магчымасць унесці ўклад у развіццё краіны.

У талаўз, якую распачалі яшчэ 17 жніўня, паўдзельнічалі супрацоўнікі арганізацый, падначаленых Міністэрству культуры: Нацыянальнага мастацкага музея, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, "Белрэстаўрацыі", Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Маладзёжнага тэатра эстрады, Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" ды іншых.

Кампус Мінскага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава ўвядуць у эксплуатацыю да верасня. У навучальным корпусе будуць размешчаны кабінеты адміністрацыі, класы, актавая і спартыўныя залы, майстэрні жывапісу і дызайну, бібліятэка і буфет. У новы інтэрнат трапяць 85 таленавітых хлопцаў і дзяўчат.



Гранты гарантуюць якасць

Дзякуючы грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, культуры ладзіцца шмат выбітных праектаў. Сярод іх — "Новае дыханне" брас-квінтэта A.M.A.D.I.S. Brass Вялікага тэатра і "Музыка. Таленты. Сутворчасць" студэнцкага камернага аркестра Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Брас-квінтэт A.M.A.D.I.S. Brass узначальвае загадчык трупы аркестра Вялікага тэатра трубач Дзмітрый Гарбарчук. Яго праект "Новае дыханне" — гэта выбітныя імпрэзы, складзеныя з беларускіх прэм'ер, а таксама са свежых прачытанняў айчыннай і сусветнай класікі, у тым ліку з опернымі салістамі. Калектыў і раней выяўляў вялікую цікавасць да нацыянальнай спадчыны, удзельнічаў у цыкле канцэртаў найноўшай беларускай музыкі "Трамантана". Для цяперашняга праекта кампазітары таксама напісалі шэраг адметных твораў. Слухачы горача віталі праграмы, паказаныя ў Віцебскай абласной філармоніі, у Мазыры, Бярозе, Рэчыцы, у Нясвіжы на фестывалі "Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў" і, вядома, у камернай зале самога тэатра.

Прэм'ерны цыкл "Харал і гімн" Вячаслава Кузняцова — бы шлях ад цемры да святла. Ён пачынаецца з асобных гукаў-ударэў тубы і літаўраў. Да мернага жалобнага шэсця далучаюцца іншыя інструменты — і, нібыта адлюстроўваючы адраджэнне з попелу, гучыць урачысты гімн, мелодыя якога становіцца ўсё больш узвышанай, упэўненай, набірае моц. "Прыдарожнае кафэ" Віктара Войціка пераносіць выступленне ў эстрадна-джазавую плынь з яркімі сучаснымі ноткамі, а лірычная сярэдзіна твора схіляе да рамантыкі. "Рух планет" Аліны Безенсон вырашаны як узнёслае меладычнае любаванне і прысвечаны першай беларускай касманаўтцы — Марыне Васілеўскай.

Удзел кантрабаса і фартэпіяна ператварае калектыў у своеасаблівы міні-бэнд. Такім складам выконваюцца шматлікія пералажэнні. У песнях Алены Атрашкевіч духавыя не толькі падтрымліваюць салістаў працяглымі акордамі, але і ствараюць выразныя падгалоскі. Дзякуючы ім "Паўзабыты свет" на верш Наталлі Танюкевіч набыў блюзавае адценне. У ваенна-патрыятычнай "Баладзе пра маці" на словы Васіля Жуковіча дна з труб замяняецца на карнет з больш мяккім тэмбрам.

Упрыгожылі праект і пералажэнні некалькіх твораў Яўгена Глебава. Зусім іначай загучала знакамітае адажыа з балета "Маленькі прынц". Герой быццам узмужнеў: спачатку тэму вяла валторна, потым труба і нарэшце трамбон, а сцішаны голас вібрафона дадаваў музыцы чароўную таямнічасць, уласцівую казцы.

Сярод салістаў быў і Віктар Пузыня — кларнетыст аркестра Вялікага тэатра. Выконваючы з брас-квінтэтам яўрэйскія фальклорныя мелодыі, якія таксама сустракаюцца ў нашай краіне, артыст наблізіў сваю ігру да традыцый яўрэйскага народнага музіцыравання.

Удзельнічаў у канцэртах і квартэт трамбаністаў на чале з Андрэем Міхалевічам — рэдкі нават па сусветных мерках калектыў, таксама складзены з аркестрантаў Вялікага.

На "Вечарах у замку Радзівілаў" да музыкантаў далучылася майстар пясочнай анімацыі Святлана Клімянціна. Гімн Вячаслава Кузняцова яна ўбачыла як узвядзенне Нясвіжскага палаца, а развіццю дзеі ў "Руху планет" знайшла візуальны аналаг. Нябеснае цела ператваралася ў вока, дзявочы партрэт, у фінале ж узнікалі пазнавальная выява Марыны Васілеўскай і надпіс "Космас наш".

Напарадзе — прэм'ерныя канцэрты праекта "Новае дыханне", у тым ліку ў Мінску і Рэчыцы. Не прапусціце!

Брас-квінтэт A.M.A.D.I.S. Brass

Мікалай Церан, кіраўнік студэнцкага камернага аркестра, старшы выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі

ПЛЁННАЯ СУТВОРЧАСЦЬ

Юныя выканаўцы апошнім часам усё часцей выступаюць з дарослымі калектывамі. Да філарманічнага абанемента "Іграем з аркестрам" далучыліся праекты Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра імя М. Фінберга "Мары дзяцінства", "Мы — музычная будучыня краіны". Таксама сёлета запланаваны шэсць імпрэз "Музыка. Таленты. Сутворчасць", на якіх юныя салісты іграюць у суправаджэнні маладых аркестрантаў з маладым дырыжорам. Але ж навізна апошняга цыкла не толькі ў яго цалкам моладзевай скіраванасці.

— Асаблівасць праекта ў тым, — гаворыць **Мікалай Церан**, кіраўнік студэнцкага камернага аркестра, старшы выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, — што мы закранаем выхаванцаў і пачаткоўк, і сярэдняй ступені адукацыі. Прычым шукаем найлепшых не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй рэспубліцы. І галоўнае — яны не проста іграюць з аркестрам, а атрымліваюць шэраг майстар-класаў. Для нас важны і вынік у выглядзе публічнага выступлення, і сам працэс паслядоўнай, працяглай падрыхтоўкі, тыя рэпетыцыі, якія крок за крокам удасканальваюць выкананне. Салісты прыязджаюць разам з выкладчыкамі. Мы ж запрашаем на рэпетыцыі вядучых педагогаў акадэміі, каб яны прыглядзеліся да будучых абітурыентаў, далі парады. Юныя музыканты вяртаюцца дадому, прадаўжаюць заняткі — і прыязджаюць да нас зноў. На кожнай рэпетыцыі, а потым на канцэрце запісваюцца відэа. У выніку робіцца своеасаблівы бэкстэйдж, на якім відаць, як паляпшаецца выкананне твораў. У юных музыкантаў з'яўляецца магчымасць параўнаць сябе ўчарашніх і сённяшніх, заўважыць станоўчыя змены, адчуць радасць не толькі ад канцэрта, але і ад працоўных момантаў. Так, акадэмія пазіцыянуе сябе як цэнтр музычнай адукацыі краіны, можа больш шырока распаўсюджваць, укараняць найноўшыя педагагічныя тэндэнцыі.

Праект выклікаў вялікую цікавасць. Было даслана больш за 150 заявак з відэазапісамі ігры, адабралі 18 чалавек. Сярод шчасліўчыкаў музыканты з Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Наваполацка — не толькі скрыпачы і піяністы, але і цымбалісты, баяністы, акардэаністы, віяланчэлісты, флейтысты. Мікалай Церан падрыхтаваў аркестроўкі твораў, прызначаных для іншага інструментальнага складу. Адбылося ўжо тры канцэрты. Першы — у рамках VII Міжнароднага Велікоднага фестывалю. Далейшыя — у сталічных ДМШМ № 2 імя Мікалая Аладава і № 10 імя Яўгена Глебава, што зрабіла такія імпрэзы майстар-класамі для гледачоў-вучняў. Напарадзе выступленні ў Акадэміі музыкі, каледжы імя Міхаіла Глінкі, ДМШМ № 1 імя Ларысы Александроўскай. Прычым праграмы не паўтараюцца, штораз гучаць іншыя творы і імёны юных салістаў.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Беларусь і Кітай — на векі вечныя

Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм” і кампанія “Сычуань Блю Айз Фільм энд Тэлевіжн Калчар Медыя” заключылі пагадненне аб сумеснай вытворчасці стужкі “На векі вечныя”. Карціна стане першым сумесным праектам Беларусі і Кітая.

Лэй Хань і Юрый Аляксей пасля падпісання пагаднення

Супрацоўніцтва дзвюх краін у кінасферы пачалося яшчэ ў мінулым годзе, калі кітайская дэлегацыя наведала XXIX Мінскі міжнародны фестываль “Лістапад”. Тады ў рамках форуму была падпісана дамова аб намерах і прайшло знаёмства з айчыннай студыяй. А ўжо сёлета стартуюць здымкі першай у гісторыі супольнай беларуска-кітайскай стужкі.

— Такія пагадненні ўмацоўваюць сяброўства краін. І наша карціна ляжа ў аснову міждзяржаўных адносін, паколькі стане нацыянальным праектам. Для “Беларусьфільма” выхад на рынак Кітая — важны і перспектыўны этап. Гэта не проста збег акалічнасцей, за такім дасягненнем — праца цэлага калектыву. І я рады, што мы знайшлі ў асобе кітайскіх партнёраў надзейных, прыстойных, блізкіх па духу людзей. Упэўнены, што кіно атрымаецца годным, бо яно будзе несці самае галоўнае — культуру і традыцыі Беларусі і брацкага Кітая. Насамрэч, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, у нас шмат агульнага, — лічыць генеральны дырэктар Нацыянальнай студыі “Беларусьфільм” **Юрый Аляксей**.

Карціна раскажа гісторыю двух маладых людзей, якія выраслі ў розных краінах і выхоўваліся ў розных культурах, але воляй выпадку адпраўляюцца ў адно падарожжа. Крок за крокам героі разблытваюць забытую гісторыю гібелі ў 1939 годзе ў Кітаі беларускага лётчыка. Падрыхтоўка сцэнарыя ў кінематаграфістаў заняла каля 10 месяцаў.

— Сюжэт умоўна будзе падзелены на дзве часткі: сучасную і гістарычную. Гістарычная ахопіць пачатак Другой сусветнай вайны, калі савецкія добраахвотнікі дапамагалі кітайцам змагацца з японскімі агрэсарамі. Такім чынам, наша асноўная мэта — паказаць, што супрацоўніцтва Кітая і Беларусі зарадзілася даўно і што абедзве краіны нават у вайну былі настроены на мір. Сучасная гісторыя заклікана прадэманстраваць прыгажосць Кітая і Беларусі, а таксама духоўныя і жыццёвыя каштоўнасці насельніцтва, — тлумачыць генеральны дырэктар кампаніі “Сычуань Блю Айз Фільм энд Тэлевіжн Калчар Медыя”, намеснік старшыні Асацыяцыі кінематаграфістаў правінцыі Сычуань, рэжысёр і артыст вышэйшай катэгорыі КНР Лэй Хань.

Рашэнне аб правядзенні здымак у Беларусі было прынята яшчэ падчас першага візіту на айчынную студыю. Тады замежны рэжысёр адзначыў пераемнасць традыцый у кінавытворчасці нашай краіны і выказаў жаданне аб частковых здымках у Сінявокай. Аднак сёння ўжо вядома: “Беларусьфільм” не застанецца ўбаку і на этапе постпрадакшну.

— Запіс і звядзенне гуку магчымыя і ў нас на кінастудыі, але графіку і астатняе мы будзем рабіць у Кітаі, паколькі там больш сучасныя тэхналогіі. Аднак я хачу, каб нашы аператары і спецыялісты па мантажы прысутнічалі на постпрадакшне, каб быў абмен вопытам, — дадае Юрый Аляксей.

Такой жа пазіцыі ў дачыненні да супрацоўніцтва прытрымліваюцца і замежныя калегі:

— У Кітаі вельмі развітая індустрыя кіно, а ў Беларусі існуе нацыянальная студыя з доўгай, 100-гадовай гісторыяй. Таму мы, безумоўна, зацікаўлены ў супрацоўніцтве з беларускімі кінематаграфістамі, якое можна назваць шырокафарматным, бо яно дазволіць нашым краінам даведацца больш адна пра адну, — дзеліцца меркаваннем **Лэй Хань**.

Падпісанне дамовы з КНР — знамянальная падзея для айчыннага кінематографа ў юбілейны год, вынікам якой стане не толькі сумесны фільм, але і адкрыццё перспектыў для далейшай супольнай дзейнасці.

— Гэта хоць і першы, але цвёрды, упэўнены крок. У будучыні мы разгледзім магчымасць сумеснага стварэння анімацыі, паколькі і ў нас, і ў Кітаі гэта вельмі развіты і перспектыўны кірунак. Я таксама разлічваю на маладых спецыялістаў, якія сёлета прыйшлі на кінастудыю па размеркаванні. Нам ёсць з чаго браць прыклад, ёсць у каго вучыцца і пераймаць вопыт. Але самае галоўнае, што такім чынам мы яшчэ больш умацуем сяброўства паміж дзяржавамі, — падсумаваў Юрый Мар’янавіч.

Ужо адбыліся кастынгі на галоўныя і эпізадычныя ролі ў Мінску. Кітайскія кінематаграфісты сумесна з беларускімі калегамі выбралі лакацыі для здымак у Сінявокай, якія стартуюць у кастрычніку. Выхад фільма “На векі вечныя” запланаваны налета. Карціна будзе прымеркавана да 80-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Яўгенія ГАБЕЦ
Фота аўтара

Слова маладых патрыётаў

Тыдзень застаўся да прэм’еры стужкі Нацыянальнай студыі “Беларусьфільм” — “Культурны код”. Карціна, якая раскажа пра дзяржаўныя сімвалы, прысвечана Дню народнага адзінства.

Кіно пра значэнне трох сімвалаў дзяржаўнасці — герба, гімна і сцяга — нацэлена на школьнікаў і студэнтаў. Разам з галоўнымі героямі — выпускнікамі Акадэміі мастацтваў — публіка знойдзе адказы на пытанні: які сэнс моладзь укладвае ў дзяржаўныя сімвалы нашай краіны і чаму выбірае для жыцця Беларусь? Стужка прымусіць задумацца, што такое культурны код, але даваць азначэнне кожны будзе сам, зазірнуўшы ўглыб сябе.

— Нягледзячы на невялікі — 35 хвілін — хронаметраж, тэма ўзнімаецца даволі сур’ёзная, таму творчая група адказна падышла да праекта, — распавядае рэжысёр карціны **Кірыл Халецкі**. — Перад намі стаяла задача як мага больш моладзева і цікава расказаць пра важныя рэчы і новаму пакаленню, і дарослым. Стужку зрабілі ў кароткі тэрмін, літаральна за лета, дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры. У фільма эксперыментальная форма, у ім аб’яднаны агульным сюжэтам ігравыя і дакументальныя сцэны. Спачатку не ўсе разумелі, як можна злучыць два віды кіно і ці ўдасца эксперымент. Але пасля першых паказаў на Савеце па кінематаграфіі здымачнай групе, незалежнай публіцы мы ўпэўніліся, што карціна атрымалася. Цяпер хочацца зваротнай сувязі ад звычайнага гледача: ці ўсё спадабалася?

У фільме ёсць элементы сацыяльнага апытання мінчан, каментарыі экспертаў з Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці, унікальныя кадры аўтапрабегу, акцыі “Праспяваем гімн разам” і эксклюзіўнае выступленне Прэзідэнцкага аркестра.

Прэм’ера “Культурнага кода” пройдзе 5 верасня ва ўсіх кінатэатрах краіны, а папярэдні паказ — падчас Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах, у павільёне Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”.

Трэйлер фільма “Культурны код”

Падчас XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Гродна, 2024

Шматаблічная сям’я

Падтрымаць развіццё культур нацыянальных меншасцей

Сучасная поліканфесійная Беларусь — прыклад мірнага суіснавання розных культурных пластоў у межах адзінай краіны. На агульнай дабратворнай справе — забеспячэнні рэлігійнай згоды — засяроджаны сілы кіраўніцтва дзяржавы, грамадскіх абяднанняў і творчых калектываў. Чарговы раз міжканфесійныя адносіны разглядаліся на канферэнцыі “Беларусь шматаблічная: узаемадзеянне культур і рэлігій”, якая адбылася 22 жніўня ў Доме прэсы. У мерапрыемстве паўдзельнічалі прадстаўнікі апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, а таксама старшыні грамадскіх аб’яднанняў.

Сёння, як адзначыў намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей **Сяргей Герасіменя**, колькасць афіцыйна зарэгістраваных канфесій працягвае павялічвацца: у 1996-м іх было каля дзвюх тысяч, зараз — больш за тры. Этнічны склад насельніцтва беларускіх зямель у мінулым таксама ніколі не быў гамагенным. Гэтая тэндэнцыя ўласцівая і сучаснасці: згодна з перапісам 2019-га, звыш 150 народаў пражывала ў той момант на тэрыторыі нашай дзяржавы. Для падтрымкі дыяспар дзейнічае падпраграма “Культурная спадчына” праграмы “Культура Беларусі” на 2021—2025 гады, якая дазваляе эфектыўна вырашаць фінансавыя ды іншыя пытанні. Як вынік — элементы розных нацыянальных культур гарманічна спалучаюцца, што стварае адметны беларускі каларыт.

— Каштоўная асаблівасць нашай краіны — міжнацыянальная згода. У грамадстве амаль адсутнічаюць канфлікты на расавай глебе, таму Беларусь здаецца ў пэўным сэнсе “белай варонай” сярод іншых дзяржаў, — падкрэсліў Сяргей Герасіменя.



Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур даўно стаў для выхадцаў з іншых краін другім домам. Дзякуючы Дзяржаўнай праграме “Культура Беларусі” кожны год тут ладзяць мноства мерапрыемстваў. У іх удзельнічаюць творчыя калектывы, якія прадстаўляюць традыцыйную спадчыну сваіх народаў. Работа ўстановы скіравана таксама на фарміраванне добрасуседскіх міжканфесійных адносін. На святы, якія праводзіць цэнтр, адзін да аднаго завітваюць праваслаўныя, каталікі, мусульмане, іўдзеі.

— Нашы калектывы актыўна прэзентуюць свае дасягненні за мяжой, — распавяла дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур **Вольга Якабсон**. — Цяпер нас часцей запрашае Расія, але Дні беларускай культуры праходзяць у многіх краінах на ўзроўні міністэрстваў у рамках пагадненняў. Супрацоўнічаем і з беларусамі замежжа: там, дзе развіта дыяспара, адзначаюцца традыцыйныя святы, напрыклад Купалле. Нават у далёкай Іарданіі беларуска Аксана Чамеза спецыяльна набывае нашы цукеркі, каб віншаваць знаёмых з Калядамі. Летась да 20-годдзя UNESCO цэнтр стварыў выставу “Дакрануцца да спадчыны душой”, якую зараз выкарыстоўваюць многія пасольствы краіны.

— У Беларусі людзей ацэньваюць не па нацыянальных і рэлігійных перакананнях, а па маральных і прафесійна-дзелавых якасцях, — падкрэсліў старшыня армянскага культурна-асветніцкага таварыства “Айастан” **Георгій Егіязаран**. — Міжнацыянальная і міжканфесійная згода — адзін з найважнейшых фактараў стабільнасці. Кіраўніцтва дзяржавы стварае ўсе ўмовы для мірнага суіснавання людзей розных веравызнанняў.

Немалаважную ролю ў захаванні стабільнасці адыгрываюць і грамадска-культурныя аб’яднанні, на базе якіх у 2008 годзе быў заснаваны Кансультатыўны міжканфесійны савет. Ён садзейнічае ўмацаванню дабратворных адносін паміж членамі дыяспар ды інтэгруе ў беларускае грамадства нацыянальныя меншасці.

— Мы ўдзельнічаем у Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур і святкаванні знакавых падзей (Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці, Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа). Штогод наша аб’яднанне, каб расказаць моладзі пра мінулае краіны, праводзіць шэраг мерапрыемстваў у Брэсцкай крэпасці. Сёлета ў гонар 80-годдзя вызвалення Беларусі члены савета сабраліся з прадстаўнікамі многіх канфесій у Крыжаўзвіжанскім храме. Гэтая знакавая сустрэча была прысвечана захаванню памяці аб нашых гераічных продках, — дадаў Георгій Егіязаран.

Старшыня Міжнароднага грамадскага аб’яднання “Гора” **Хізры Асадулаеў** расказаў пра дагестанскую дыяспару, якая з’явілася ў Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны.

— Я прыехаў сюды дыпламаваным скульптарам пасля вучобы, пачаў творчую дзейнасць і сфарміраваўся як асоба менавіта тут. Пазней мае заслугі былі адзначаны на дзяржаўным узроўні медалём Францыска Скарыны, — распавёў Хізры Асадулаеў. — Беларусы — гэта душэўная дабрыня і працавітасць, якую прыкмячаюць амаль усе замежныя госці.

Больш за 30 гадоў украінцаў у нашай дзяржаве падтрымлівае грамадскае аб’яднанне “Ватра”.

— Мы з беларусамі маем моцнае моўнае і культурнае падабенства, — канстатаваў старшыня арганізацыі **Уладзіслаў Кадзіра**. — Разам мы прайшлі некалькі важных гістарычных этапаў. Напрыклад, вызваленне ад захопнікаў падчас Вялікай Айчыннай вайны, у выніку якога 226 украінцаў атрымалі званне Героя Савецкага Саюза.

Забеспячэнне ўмоў для захавання і развіцця традыцый розных народаў — гэта заслуга, на думку Уладзіслава Кадзіры, менавіта кіраўніцтва дзяржавы.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота Ульяны КАСЦЮНІНАЙ і Дома прэсы

Забыццю не падлягае

Беларускія жывапісцы выказалі свае адносіны да вар'яцтва, імя якому — вайна. Выстава "Жывыя, пакуль памятаем" створана па выніках пленэру, прымеркаванага да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Беларусі і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў.
У пленэры ўдзельнічалі члены Беларускага саюза мастакоў, студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — усяго 12 аўтараў. Жывапісцы наведвалі мемарыяльныя комплексы на месцах канцэнтрацыйных лагераў і спаленых вёсак, вывучалі гістарычныя факты аб Вялікай Айчыннай вайне. Уражанні ўвасобіліся ў партрэтах і сюжэтна-тэматычных палотнах, прысвечаных падзеям вогненных гадоў.

Мастакі прадставілі партрэты дзяцей вайны, вымушаных змагацца за жыццё, карціны-прысвячэнні героям беларускага супраціўлення. Адлюстраваны і мемарыяльныя комплексы, на месцах якіх былі канцэнтрацыйныя лагеры, лагеры ваеннапалонных, спаленыя вёскі.

Уражанне ад убачанага — быццам токам па нервах.

Вось пазітыўныя рознакаляровыя класікі на асфальце: ах, маленства-маленства! А вышэй — босыя ножкі ў кайданах. Ком у горле... Марыя Кручкова, "Так скончылася дзяцінства".

Малюначкі, паўпрыкрытыя туманам. Просценькія, наіўныя: конік, тата, утаймавальнік тыграў. Нехта з маленькіх аўтараў мог бы стаць вялікім мастаком. Або дрэсіроўшчыкам. Або касманаўтам. Папяровы караблік — сімвал надзей. Няздзейсненых. Нацысцкія садысты выпампоўвалі з дзяцей кроў для сваіх салдат... Адводзіш вочы. Слёзы выціраеш не крадком: тут плакаць не соромна. Марта Шчэрбіч, "Мемарыяльны комплекс «Красны Берег»".

— Перад студэнтамі, што ўдзельнічалі ў пленэры, стаяла нятростая задача — пераасэнсаваць, прапусціць праз сябе трагедыю і зрабіць твор, які б адпавядаў узроўню дарослага, сфарміраванага мастака. Аўтарам прац, што тут прадстаўлены, гэта ўдалося: палотны атрымаліся сур'ёзныя. Маладое пакаленне, якое, дзякуй богу, не бачыла вайны, асэнсавана перадало жах тых пакут, гора і болі, што зведалі нашы продкі, — адзначыў дырэктар НЦСМ **Сяргей Крыштаповіч**. — Я спакойны за будучыню беларускага мастацтва. Рады, што наш цэнтр робіць унёсак у станаўленне маладых творцаў.

— Першы паказ праекта адбыўся 11 ліпеня ў рамках XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Зараз экспазіцыя даступная ў НЦСМ. Спадзяюся, яе змогуць убачыць і ў іншых гарадах краіны, — распавядае дырэктар Беларускага культурнага цэнтра духоўнага Адраджэння **Аляксандр Госцеў**, дзякуючы якому ўдзельнікі пленэру папрацавалі ў мемарыяльным комплексе "Трасцянец". — Аўтары работ па-сапраўднаму прасякліся тэмай. Я быў сведкам таго, як мастакі наведвалі крыпту храма-помніка ў гонар Усіх Святых, дзе знаходзіцца прах ахвяр Трасцянецкага лагера смерці, і наколькі гэта ўзрушыла творцаў. Іх эмоцыі знайшлі яркае адлюстраванне на палотнах.

Аўтар дыптыха "Забыццю не падлягае" і карціны "Вечная памяць" — **Аляксандра Чудакова**, студэнтка 6 курса Акадэміі мастацтваў. Дзяўчына — актыўная ўдзельніца беларускіх і замежных выстаў, лаўрэат розных конкурсаў. Цяперашні пленэр лічыць добрай магчымасцю пашырыць гарызонты і ўдасканаліць навыкі.

— Наведванне кожнай мясціны стала сапраўдным узрушэннем. Неймаверна ўразіў манументальнасцю і трагічным пасылам мемарыял "Азарычы". Гісторыя лагераў смерці ў Азарычах адлюстроўвае адно з самых гнюсных злачынстваў фашысцкіх захопнікаў, здзейсненых на беларускай зямлі. Тут упершыню была масава прыменена бактэрыялагічная зброя — узбуджальнік сыпнога тыфу. Немагчыма без слёз знаходзіцца і ў мемарыяльным комплексе "Боркі", прысвечаным памяці спаленых вёсак Магілёўшчыны. Жах трагедыі ўвасабляюць скульптурныя кампазіцыі ды іншыя элементы: вуліца з фрагментамі абгарэлых сцен дамоў, пакінутыя ў іх рэчы як сімвал раптоўнага скончэння мірнага жыцця і безабароннасці перад нечалавечай жорсткасцю... Бачыць усё гэта было надзвычай цяжка. Але менавіта таму мае боль, гнеў, суперажыванне, нянавісць нібы самі выліваліся на палатно...

— Кожнае наша апавяданне наведвальнікам павінна быць эмацыйным — каб убачанае і пачутае кранала людзей, прымушала задумацца. А такія выставы дазваляюць нам самім яшчэ больш прапусціць праз сябе ўсё, што адбывалася ў ваеннае лігхалецце, і натхніцца на пошук і вывучэнне новых фактаў, складанне яшчэ больш пазнавальных экскурсій.

Ксенія Колабава, другакурсніца Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры БДАМ:

— Мы, маладыя, проста абавязаны памятаць, якой цаной далася нашым дзядам Перамога. Памятаць і быць удзячнымі!

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота аўтара

1. Фрагмент карціны "Вязніца". Анастасія Чадзій
2. "Мемарыяльны комплекс «Боркі»". Марта Шчэрбіч
3. "Мемарыяльны комплекс «Азарычы»". Кацярына Друян
4. "Мемарыяльны комплекс «Красны Берег»". Марта Шчэрбіч
5. Маладая мастачка Аляксандра Чудакова каля сваёй карціны "Вечная памяць"
6. Фрагмент карціны "Дальва". Ганна Раманенка

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, мастак Сяргей Крыштаповіч:

— Дзяцінства нашага пакалення было напоўнена ўспамінамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Мой бацька ў 14 гадоў пайшоў у партызаны. Потым да нас дамоў часта прыязджалі яго баявыя таварышы. Іх апавяданні фарміравалі разуменне, якое ж гэта шчасце, калі свеціць сонца і неба над табой мірнае.

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Алена Макаранка:

— Мы цесна супрацоўнічаем з НЦСМ. Заўсёды рады бачыць новыя праекты калег. Экспазіцыя "Жывыя, пакуль памятаем" патрабавала тытанічнай працы. Выстава ўзрушае глыбінёй твораў і выклікае вельмі шмат моцных эмоцый.

Марына Вашкевіч, загадчыца аддзела навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай работы мемарыяльнага комплексу "Хатынь":

— Сёння, калі робяцца спробы перапісаць гісторыю, надзвычай важна захаваць праўду пра Вялікую Айчынную вайну, пра подзвіг старэйшых пакаленняў і перадаць яе нашым дзецям. Мір на зямлі немагчымы без гістарычнай памяці.

Ганна Жарская, навуковы супрацоўнік мемарыяльнага комплексу "Хатынь":

KULTURA-INFO.BY Выстава "Выяўленчае мастацтва Мардовіі" прадстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Попел і птушкі Хатыні

У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі спектаклю патрыятычнай тэматыкі больш, чым у якім іншым. А нядаўна рэпертуар папоўніўся яшчэ адным — пастаноўкай "Хатыня" пра трагедыю гэтага і іншых паселішчаў, спаленых у вайну.

Шырока вядомы крыху іншы варыянт геаграфічнай назвы — Хатынь. Але ж самі жыхары называлі сваю вёску Хатыня. Пагадзіцеся, такая версія больш мілагучная, працяглая. Замест двух складоў — тры, і гэта дакладней адпавядае беларускаму маўленню з яго імкненнем да галосных, што забяспечваюць мове пявучасць. Увесь спектакль атрымаўся такім жа "пявучым", паэтычным, запаволеным, нягледзячы на экспрэсіянісцкую тэматыку і жанравае азначэнне — "прадчуванне трагедыі".

У аснову пакладзены сапраўдныя падзеі, памастацку паднесеныя ў аповесці "Жаваранкі над Хатынню". У гэтым творы, што з'явіўся ў 1970-я, шмат увагі нададзена часу, што папярэднічаў трагедыі, і акцэнтуюцца не знешнія падзеі, а ўнутраны свет герояў, іх жыццё, думкі, памкненні. А яшчэ — сны, што аказваюцца прарочымі. Да аповесці ўжо звяртаўся паэт і журналіст Зміцер Арцюх, прапанаваўшы сваю п'есу "Жаваронкі". Але гэтым разам сцэнічную адаптацыю рабіў сам рэжысёр-пастаноўшчык — Аляксандр Бародка. Сціслая, кампактная, яна ўлічвае асаблівасці тэатральнай дзеі, аддаючы перавагу паказу, а не аповеду. Тэксту зусім нямнога, ды пры ўсіх скарачэннях дабаўлены сухія інфармацыйныя фрагменты. Такія паведамленні, мінімальныя па аб'ёме (літаральна пара сказаў), узмацняюць дакументальнасць і выводзяць дзеянне на ўзровень гістарычных абагульненняў. У спектакль уплецены народныя песні, што выконваюцца ў аўтэнтычнай манеры і, як заўжды ў гэтым тэатры, жыўцом. Яны не проста ўпрыгожваюць агульную фанасферу, а даюць усяму аповеду своеасаблівы пункт апоры — гэта тая духоўная спадчына, якую прыйшлі разбурыць гітлераўцы.

Мастачка Марына Алекна стварыла даволі рэалістычную і адначасова сімвалічную сцэнічную прастору. З аднаго боку — лес. З другога — вясковы падворак з драўляным плотам. Толькі агароджа не з габляваных дошак, а з доўгіх сухіх галін, пераплеценых між сабой, — тыповая для перадваеннай вёскі. З глядзельнай залы гэты закруглены астравок нагадвае гняздо — сімвал дому, сямейнага кола, хатняй абароненасці. Бо і назва Хатыня азначае хату, і адным з яркіх вобразаў-сімвалаў становяцца птушкі. У першай сцэне іх не бачна, чуецца цвіньканне. У фінале ж яны паўстаюць як атрыбут абраду. Вёска была спалена 22 сакавіка — акурат калі беларусы спраўляюць Гуканне вясны і з цеста робяць жаўрукоў, каб тыя хутчэй вярталіся з выраю дамоў. Аднак тут жаваранкі не печаныя, а папяровапразрыстыя, на нітачках. Душы спаленых людзей будуць развешваць фігуры птушак на дрэвах — каб вясна ўсё роўна прыйшла! Зіма тут асацыіруецца не з Калядамі, а са снегам, прынесеным ветрам. І той снег аказваецца попелам суседняй знішчанай вёскі.

Такія ж сімвалічныя і сцэнічныя строі. Звыклае адзенне носяць хіба партызан Кузьма (Уладзіслаў Віленчыц) і яго антаганіст — стараста Гнат (Алесь Ніканенка), што прыслужвае ворагу. Ва ўсіх астатніх зверху накінуты лёгкія напаўпразрыста-белыя плашчы-халаты. З самага пачатку спектакля гэта ўжо не жывыя людзі, а спаленыя — гэта душы, што распавядаюць пра сябе, свае няспраўджаныя мары.

Перад намі з'яўляюцца асобныя вяскоўцы, і іх сумесны партрэт становіцца псіхалагічным зрэзам некалькіх пакаленняў. Адась (Сяпан Краўчук) і Марыся (Юлія Гружэўская ці ў іншым складзе Юлія Лазоўская) — закаханыя падлеткі, якія маглі б ажаніцца, выхоўваць дзяцей, а потым і ўнукаў. Лёкса (Арсеній Луцкі) — тонкая паэтычная натура, надзеленая пантэістычным светаўспрыманнем. Ён мог бы ўзрасці да сапраўднай творчай асобы з добра развітой фантазіяй і спагадлівым сэрцам. Людзі сярэдняга і старэйшага пакаленняў маглі б падтрымліваць моладзь, заставацца вытокамі мудрасці. Дзед Карабан (каларытны Канстанцін Вораная ці Ігар Сідорчык), падобна на тое, заспеў яшчэ Першую сусветную. Васіль (Сяргей Шымко) таемна дапамагае партызанам, а не толькі займаецца гаспадаркай. Яго жонка Адэля (Надзея Цвяткова ці Веранікa Буслаева) вечна ў клопатах пра дзяцей. Бабка Тэкля (Ганна Анісенка), здараецца, пагарачыцца і скажа чаго залішняга, але ж выступае захавальніцай народных традыцый. Стэфа з суседняй спаленай вёскі (Галіна Чарнабаева) страціла розум пасля таго вогнішча, але яе блытаныя выказванні ўспрымаюцца як глыбока сімвалічныя папярэджанні. Тэкля і Стэфа — быццам адбіткі адна адной, адлюстраванні абагульненай гераіні да і пасля жудаснай падзеі. Невыпадкова ў розных складах гэтыя артысткі змяняюцца між сабой.

Сцэна спалення вырашана вельмі проста і ціха, без аніякіх экспрэсіянісцкіх фарбаў. Вакол "гнязда", унутры якога стаяць бязмоўныя вяскоўцы, Гнат складае штосьці накшталт шалаша з самых доўгіх галін. Персанаж апраўдвае сябе тым, што толькі выконвае загад. Знаёмыя словы! А сукаватыя палкі загараюцца чырвоным, адліваюць чорным, пакуль не згаснуць цалкам. Тое чарноце пераклікаецца з бельмі напаўпразрыстымі сталамі дрэў, становіцца іх супрацьлеглым полюсам і вымушае згадаць іншы пажар — лясны, у самым пачатку спектакля, калі маланка ўдарыла ў хвою. Два вогнішчы, вырашаныя прынцыпова рознымі светлавымі эфектамі, утвараюць своеасаблівую арку. А сасна ў полымі прадказвае і без таго вядомы фінал.

Фашысты ў спектаклі не з'яўляюцца. Мы толькі з трывогай чуем упэўнены грукат іх каваных ботаў — і пагружаемся ў няўмольна катастрафічнае чаканне бязлітаснасці. Ды і ўвесь спектакль атрымаў жанравае азначэнне "прадчуванне трагедыі", што разам з душамі-прывідамі, якімі мы бачым герояў, дыктуе дзеі амаль містычную, гіпнатычную запаволенасць...

Тэатр распачаў 33-і сезон, назваўшы яго "Сезон пазнанняў". Лагатыпам абрана папараць-кветка, якую калектыў лічыць за "сімвал пазнання новага". "Лісце папараці — як бясконцы зварот да сябе, то-бок самапаглыбленне, самавывучэнне, палаючая кветка ўнутры — як росквіт, энергія і жыццё". Сапраўды, наперадзе шмат цікавага!

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва тэатра

Сцэны са спектакля

KULTURA-INFO.BY Кітайскі цэнтр кнігі працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Музей Беларускага Палесся

Жыў-быў і будзе жыць

Чым багатая палеская скарбніца?

Сёлета Музей Беларускага Палесся — адзін з найстарэйшых у краіне — святкуе векавы юбілей. Размешчаныя на двух паверхах былога езуіцкага калегіума пастаянныя і часовыя выставы ўзнаўляюць жыццёвы ўклад пінчукоў ад старажытнасці да нашых дзён. З нагоды значнай даты прапануем здзейсніць падарожжа ў мінулае ўстановы, разгледзець найбольш каштоўныя і цікавыя экспанаты і згадаць, за што мы так любім культурную спадчыну Палесся.

АДНОЙЧЫ Ў ПІНСКУ

Гісторыя юбіляра пачалася ў 1924-м: менавіта тады Палескае краязнаўчае таварыства прыняло рашэнне аб заснаванні музея і выбрала яго першага кіраўніка. Ім стаў настаўнік пінскай гімназіі Раман Гарашкевіч. Каля 100 археалагічных і этнаграфічных экспанатаў было прадстаўлена ўжо ў 1926-м. З таго часу фонд значна ўзбагаціўся: сёння ён налічвае больш за 95 тысяч аб'ектаў, пошукамі якіх займаліся не толькі супрацоўнікі ўстановы, але і энтузіясты з мясцовых жыхароў.

У СТАРАЖЫТНЫХ СЦЕНАХ

З 1996-га музей знаходзіцца ў будынку ранейшага езуіцкага калегіума, які з'яўляецца славутым сімвалам Старога горада. Архітэктурны шэдэўр XVII стагоддзя спалучае два стылі — барока і рэнесанс. Да 1950-х калегіум уваходзіў у комплекс адной з найбуйнейшых у былым Вялікім Княстве Літоўскім рэзідэнцый езуітаў. Тады навучальную ўстанову, якая мела найбагацейшую бібліятэку, друкарню і адну з першых у Беларусі аптэк, ведалі далёка за мяжой.

ЯКАЯ ТЫ, СПАДЧЫНА?

Экспазіцыя "Промыслы і рамёствы Палесся", з якой пачынаецца падарожжа па музеі, расказвае пра традыцыйны ўклад жыцця пінчукоў. Шматлікія рыбалоўныя і пчалярскія прылады, вырабы ўмелых кавалёў і ткачоў мінулага, а таксама плеценыя з лазы скрыні, кошыкі, вазы, калыскі ды цацкі ствараюць атмасферу аўтэнтычнага народнага побыту. Прадстаўлены тут і ўнікальныя здымкі, на якіх адлюстраваны штодзённыя заняткі палешукоў у першай палове XX стагоддзя. Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікае драўляны веласіпед, які сканструяваў жыхар вёскі Багданаўка Васіль Ільючык у 1931-м. На дзіва прыгожы і незвычайны выраб быў далучаны да фонду ў 2007-м дзякуючы дачкам майстра.

Канцэптуальным працягам першай залы выступае экспазіцыя "Гісторыя Пінщчыны", дзе прадстаўлены дзясяткі розных археалагічных знаходак. Сярод самых старажытных аб'ектаў — скамянеласці і косткі жывёл, якія даўно вымерлі, прылады працы, керамічная вельбарская чаша з арнаментам. Бронзавыя нацельныя крыжы і энкалпіёны, абраз-змеявік "Багародзіца ў дзісусным чыне", галаснік з Каложскай царквы, фігурныя керамічныя пліткі датуюцца ўжо XI—XII стагоддзямі.

Вылучаюцца асаблівай каштоўнасцю тураўскі саркафаг (XII ст.), Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года (захоўваецца выданне XVII ст., што выйшла ў Вільні на польскай мове), а таксама вісная пячатка князя Ізяслава Яраславіча, на якой выгравіраваны святы Дзмітрый і Божая Маці. Цікава, што гэты артэфакт адшукаў звычайны пінскі рабочы ў 1961-м падчас будаўніцтва жылых дамоў. Выпадкова была знойдзена і каменная булава, створаная на мяжы III—II тыс. да н. э.

ВЕК ПЕРАМЕН

Экспазіцыйныя залы "Гарадскі побыт першай паловы XX ст." і "Пінщчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны" завяршаюць расказ пра мінулае краю. Першая знаёміць з міжваенным перыядам, калі Пінск стаў буйным прамысловым цэнтрам. Галоўныя падзеі для населенага пункта ў тыя часы — заснаванне першых прадпрыемстваў (гадзіннікавы завод і фабрыка "Тобаль" братоў Лур'е), пракладанне чыгункі, імклівае развіццё тэлефоннай сувязі і выдавецкай справы — адлюстраваны ў шматлікіх экспанатах. З дапамогай сапраўдных мэблі, посуду, элементаў мужчынскага і жаночага гардэробу, туалетных і пісьмовых прылад ды іншых прадметаў супрацоўнікі музея стварылі карціну штодзённага жыцця, уласцівага беларускім гараджанам XX стагоддзя.

Зала, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, нагадвае гісторыю першага партызанскага атрада пад кіраўніцтвам В. З. Каржа, Пінскага партызанскага злучэння, баёў за вызваленне раёна ў ліпені 1944 года.

ТВОРЫ-ВАНДРОЎНІКІ

У 1961-м у Пінску з'явілася багатая калекцыя беларускага і рускага жывапісу другой паловы XIX — XX стагоддзя. Пачалося ўсё з таго, што Уладзіміру Баравікову — супрацоўніку ўстановы — прыйшла ідэя стварэння мясцовай мастацкай галерэі. Пасля сустрэчы ў Маскве з міністрам культуры СССР Кацярынай Фурцавай быў падпісаны ўказ аб перадачы гораду карцін з Дзяржаўнага мастацкага музея БССР і Дзяржаўнай Трацяякоўскай галерэі. Так увесь другі паверх будынка занялі шэдэўры знакамітых мастакоў — В. К. Бялыніцкага-Бірулі, Ю. М. Пэна, Л. Д. Шчамялёва, І. К. Айвазоўскага, І. І. Шышкіна, В. М. Васняцова ды іншых.

СПРАВЫ СУЧАСНАСЦІ

Далейшае развіццё юбіляра, па словах супрацоўнікаў, будзе звязана з новымі каштоўнымі дасягненнямі ў даследаванні гісторыі і этнаграфіі Палесся. Сёння намаганні скіраваны ў першую чаргу на стварэнне электроннага каталога фондавых аб'ектаў, навукова-асветніцкую і адукацыйную работу. Штогод установа ўдзельнічае ў рэспубліканскім праекце "Ноч музеяў", падчас якога прапануе экскурсію па падзямеллі калегіума.

Акрамя як пра захаванне і ўдасканаленне пастаянных экспазіцый, калектыў скарбніцы рупіцца пра стварэнне часовых выстаў. Сярод найбольш запатрабаваных у наведвальнікаў — "Пінск і ваколіцы", "Дзіва Палесся", "Цуд навагодняй цацкі" ды іншыя. Падобныя праекты дазваляюць падтрымліваць цікавасць нават заўсёднікаў музея.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота аўтара



Фрагменты экспазіцыі

300 гадоў — на кані

Любіце даўніну і захапляецеся гісторыяй краіны? Натхняюць народныя рамёствы і традыцыі? Марыце павучыцца беларускім танцам і ўбачыць коннікаў, як на старажытных гравюрах? Жадаеце весела правесці час у велізарнай пазітыўнай кампаніі незнаёмых людзей, якія ўжо праз паўгадзіны стануць сваімі? Значыць, вам — у Зэльву! У гэтым гарадскім пасёлку Гродзенскай вобласці ў жніўні ладзяць Ганненскі кірмаш. Мерапрыемства бярэ пачатак у XVIII стагоддзі, калі сюды з'язджаліся гандляры і рамеснікі з Рэчы Паспалітай і іншых еўрапейскіх краін. І да сёння падзея — адна з самых любімых як у мясцовых жыхароў, так і ў гасцей.

Сімвал кірмашу — коні

ТАЛАКА

— Ганненскаму кірмашу больш за 300 гадоў, але новае дыханне ён атрымаў у 2001-м, — расказвае загадчык сектара культуры Зэльвенскага райвыканкама **Галіна Раманчук**. — Калі ў 1985-м я прыехала сюды пасля заканчэння Мінскага інстытута культуры, зэльвенцы не раз згадвалі, якім грандыёзным быў кірмаш. І дзякуючы падтрымцы Гродзенскага аблвыканкама нам удалося адрадзіць фэст!

Асаблівасць цяперашняга свята ў тым, што задзейнічаны ўвесь раён. Як некалі продкі, мясцовыя жыхары рыхтуюцца да кірмашу загадзя, прыбіраюцца ў кожным двары. Улады штогод праводзяць розныя спаборніцтвы: на найлепшае аздабленне балконаў, на самы стыльны воз, на самага прыгожага каня ды іншыя. Сёлета арганізавалі конкурс касцюмаў, у якіх прадстаўнікі 12 зэльвенскіх працоўных калектываў удзельнічалі ў шэсці. На прапанову адгукнуліся людзі розных прафесій.

САМАРОДКІ

Зэльва шумела два дні. Нягледзячы на спякоту, на вуліцы выйшлі ледзь не ўсе жыхары (а іх тут амаль 6300 чалавек). Шмат было і прыезджых. Сярод іх — дэлегацыі з Ніжагародскай вобласці Расіі.

Мерапрыемствы распачаліся на пляжы — на сушы і на вадзе. Назаўтра зранку гулянне ахапіла цэнтр пасёлка і доўжылася аж да ночы. Адкрыла кірмаш тэатралізаванае дзейства, кульмінацыяй якога стала прыбыццё князя Сапегі са світай. І хоць у пралогу задзейнічалі не прафесійных акцёраў, выступленне атрымалася яскравым!

Іна Германовіч, выкладчык-харэограф мясцовай дзіцячай школы мастацтваў і кіраўнік узорнага танцавальнага ансамбля "Зальвяначка", у тэатралізаваным паказе выконвала ролю жонкі Льва Сапегі. Дачка Іны Ганна, студэнтка, пастаянна далучаецца да кірмашу з сямі гадоў.

— Такія мерапрыемствы — выдатная магчымасць прывіваць дзецям любоў і да мастацтва, і да роднага, народнага, — лічыць педагог.

МЕСЦА ДУШЭЎНАСЦІ

Да ўдзельнікаў свята звярнуўся старшыня Зэльвенскага райвыканкама **Дзяніс Альшэўскі**.

— Зэльвеншчына — край са слаўнай гісторыяй і багатымі культурнымі традыцыямі, у якіх аб'яднаны намаганні многіх пакаленняў. Ганненскі кірмаш, важная старонка нашага мінулага, прыцягвае ўсіх, хто зацікаўлены ў захаванні культурнай спадчыны. Ён садзейнічае плённаму супрацоўніцтву, дае магчымасць пазнаёміцца з рознымі відамі творчасці, таленавітымі майстрамі, апантанымі любімай справай, — сказаў Дзяніс Аляксандравіч.

Кіраўнік мясцовага самакіравання Вацкай муніцыпальнай акругі Ніжагародскай вобласці **Сяргей Лісін** заўважыў:

— Вы ўмееце здзіўляць. Вельмі добрыя ў вас людзі, ветлівыя, душэўныя.

Падчас урачыстасці ўшаноўвалі перадавікоў жніва. У іх гонар адбыўся вялікі канцэрт. Дарэчы, песні, музыка і танцы цешылі публіку цэлы дзень. Выступалі творчыя калектывы і выканаўцы з Беларусі і Расіі.

ВОЧЫ РАЗБЯГАЛІСЯ!

Фантанавалі крэатывам і падворкі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, раённых дамоў рамёстваў. Установы Зэльвеншчыны зазывалі гасцей на свае тэматычныя пляцоўкі, стылізаваныя пад лаўкі XVIII стагоддзя. Напрыклад, у "Лаўцы лекаў" частавалі настоямі з гаючых траў, у "Кніжнай" — прапаноўвалі папісаць гусіным пяром. У "Творчай" размясціліся прадстаўнікі Зэльвенскай ДШМ. У выкананні народнага ансамбля народных інструментаў "Калаж" гучала музыка, а выпускніцы ўстановы праводзілі майстар-клас па танцах.

— Кірмаш — любімае свята. Чакаем яго, рыхтуемся, бо наша місія — несці людзям прыгажосць, далучаць да народных традыцый, — распавяла намеснік дырэктара школы **Ірына Прахарэнкава**.

Сімвал фэсту — коні. Нядзіўна, бо ў Зэльве спакон веку імі гандлявалі. Вырабы тых жывёл, вырабленыя з дрэва, саломы, гліны, намаляваныя на сценах дамоў і магніціках, вытканыя, у мястэчку ў гэтыя дні паўсюль... І, вядома ж, было багата жывых коней. Ахвотныя маглі пракаціцца на павозцы, павучыцца асновам верхавой язды і ўбачыць выступленне прафесіяналаў.

А ўвечары ўсіх чакалі салют і вогненнае шоу.

УЛЮБЁНЫЯ Ў СПРАВУ

Не працяснуцца было на "Кірмашы рамёстваў". Адмысловых тавараў — безліч. Свае вырабы прывёз і разьбяр па дрэве Васіль Грабун са Слоніма. Для кампазіцыі "Коннабочкавы ход" майстар выкарыстаў фанеру, ліпу, сасну, бярозу, галінкі і нават траву. Апрацоўваў усё адной прыладай — нажом-касяком. А каб выразаць з асіны вялізныя шахматы мудрагелістай формы, патрацію год. Але часу не шкадуе: такіх фігур нідзе не знайсці!

Міхаіл Дарошка з вёскі Цераблічы Столінскага раёна здзіўляў ганчарнымі вырабамі, створанымі па тэхналогіі XVII стагоддзя.

НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ

Усе, хто завітаў на кірмаш, атрымалі добрыя ўражанні. Да прыкладу, сям'я Баравісюк бачыць унікальнасць і карысць свята ў тым, што яно адраджае культурныя каштоўнасці беларусаў і дае магчымасць акунуцца ў мінулае Радзімы.

Ніна Мікалаеўна — заўсёдніца кірмашу з Гродна — таксама ў захапленні:

— Арганізацыя — найвышэйшы пілатаж, усё культурна, прафесійна, з вялікай павагай да людзей. Мерапрыемствы пачынаюцца хвіліна ў хвіліну, працуюць валанцёры, ёсць бясплатная пітная вада. Парадак падтрымліваюць супрацоўнікі міліцыі, дзяжурыць ратавальнікі і медыцынскія работнікі, а дзякуючы камунальнікам усюды ідэальная чысціня. Пахвалы заслугоўвае і тэатралізацыя: сцэнарый прадуманы, дынамічны, а якая масавасць! І ўсе ўдзельнікі — звычайныя людзі, аб'яднаныя велізарнай любоўю да роднай старонкі і павагай да яе гісторыі.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота аўтара

Загадчык сектара культуры Зэльвенскага райвыканкама Галіна Раманчук

Неверагодныя шахматы майстра са Слоніма Васіля Грабуна

На падворках сельгасарганізацый

Ярка восень сустракаем!

Брэндавыя мерапрыемствы месяца

07.09

Раённае фальклорнае свята “Жытнёвы звон” адкрывае восеньскі каляндар культурных падзей. У Горках 7 верасня чакаецца цікавая праграма: конкурсы “Ураджай цераз край” і “Галаўны ўбор”, пленэр “З любоўю да роднай зямлі”, выставы работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, майстар-класы. А яшчэ — тэматычныя пляцоўкі “Беларускія гульні”, “Жытнёвы карагод — яднае народ” і многае іншае.

13.09 – 15.09

Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва “Сожскі карагод” пройдзе з 13 па 15 верасня ў Гомелі. Мэта — развіццё танцавальнага мастацтва, пашырэнне і ўмацаванне творчых сувязей, узаемадзеянне нацыянальных культур розных народаў. Упрыгожаннем форуму стануць выступленні найлепшых прафесійных харэаграфічных і тэатральных калектываў Беларусі і замежжа.

НА ВЕРАСЕНЬ ЗАПЛАНАВАНА ШМАТ ІНШЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ. ПАДРАБЯЗНАСЦІ — НА САЙЦЕ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

10.09 – 15.09

Міжнародны тэатральны фестываль “Белая вежа — 2024” разгорнецца з 10 па 15 верасня ў Брэсце. Горад стане цэнтрам прыцягнення рэжысёраў, акцёраў, музыкантаў і мастакоў з дзевяці краін. Насычаная праграма ўключае спектаклі розных жанраў і напрамкаў на трох мовах.

21.09

Літаратурна-музычны фестываль “Восень у Завоссі” адбудзецца 21 верасня ў музеі-сядзібе Міцкевіча ў Брэсцкім. Гасцей Завосся чакаюць займальныя лекцыі, экскурсіі, выступленні літаратараў, бібліятэчная пляцоўка, мастацкі пленэр, выставы, квэсты, гульні, майстар-класы, а таксама канцэрт самадзейнасці.

21.09

Экалагічнае свята “Жураўлі і журавіны Міёрскага краю” пройдзе 28 верасня. У праграме — конкурс ансамбляў песні і музыкі “Жураўліны звон”, міжраённы турнір па інтэлектуальнай гульні “Што? Дзе? Калі?”, конкурс сельскіх падворкаў, інтэрактыўныя выставы і экскурсіі па экалагічнай сцежцы.

Багаты на таленты

Жнівеньскі часопіс прысвечаны культуры і мастацтву Гродзенскай вобласці.

■ Прывітальнае слова старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзіміра Караніка адкрывае нумар.

■ Начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Алена Клімовіч расказвае, як у рэгіёне захоўваюць створаныя продкамі і пішуць сучасную мастацкую гісторыю.

■ Абласны фестываль “Творчыя маладзёжныя лабараторыі «Праект “МАСТАЦТВА”»” стаў добрай традыцыяй.

■ Калектыў Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці збярагае традыцыі, жыве сучаснасцю і будуе будучыню. Пра гэта распавяла дырэктар установы Кацярына Хільмончык.

■ Андрэй Пятрук знаёміць з элементамі, унесенымі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

■ Наталля Рамановіч захапляецца аўтэнтычнымі касцюмамі Панямоння.

■ Гродзеншчына славіцца святамі — як рэспубліканскімі, так і рэгіянальнымі.

■ З Аленай Рапінчук прагуляемся па музеях вобласці.

■ Стары замак у Гродне — візітоўка горада. Мастацтвазнавец Наталля Шаранговіч гутарыць з дырэктарам Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Юрыем Кітуркам ад тым, як аднаўляецца былая рэзідэнцыя каралёў.

■ Мірскі замак — адзін з найбольш папулярных аб’ектаў у турыстаў. Дасягненнямі замкавага комплексу “Мір” Антон Рудак папрасіў падзяліцца яго дырэктара Аляксандра Лойку.

■ Марына Ігнатовіч расказвае пра рэгіянальныя асаблівасці бібліятэчнай сферы.

■ Культурную прастору Гродзеншчыны цяжка ўявіць без творчасці Мікалая Бандарчука. Падрабязней — у артыкуле мастацтвазнаўца Марыны Загідулінай.

■ Папулярызацыя музычнай спадчыны і найлепшых узораў сучаснага мастацтва — галоўная задача калектыву Гродзенскай філармоніі.

■ У рэгіёне тры ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі сферы культуры даюць юным талентам пуцёўкі ў жыццё.

■ Анастасія Васілевіч і Яўгенія Бачыла запрашаюць у абласныя храмы Мельпамены.

■ Надзея Бунцэвіч гутарыць аб творчасці з галоўным рэжысёрам Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алегам Жугждам.

■ Гартаем старонкі 110-гадовай гісторыі кінатэатра “Чырвоная зорка”.

■ “Наведваем” канцэрты музычнага тэатра “Рада”, Лідскага эстраднага аркестра і заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца, музыкі і песні “Белыя росы”.

Па старонках календара

■ **30 жніўня** нарадзіўся Павел Канстанцінавіч Любамудраў (1916—1984) — мастак-графік. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, прафесар. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1957 па 1983 год выкладаў на кафедры графікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Працаваў пераважна ў станковай графіцы ў тэхніках літаграфіі, шклаграфіі, акварэлі, лінагравюры. Адзін з вядучых майстроў свайго віду мастацтва ў другой палове XX стагоддзя. Унёс важкі ўклад у фарміраванне прафесійнай школы акадэмічнага малюнка.

■ **31 жніўня** з’явілася на свет Зінаіда Іванаўна Браварская (1916—2005) — актрыса, педагог. Народная артыстка БССР. З 1938-га — актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. У 1941—1950 гадах працавала ў франтавым тэатры Масквы, тэатрах Ашхабада, Пензы, Куйбышава. Потым вярнулася ў Купалаўскі тэатр. У 1953—1955-м і з 1967-га — выкладчык Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута.

■ **1 верасня** нарадзіўся Валерый Ігнатавіч Глушакоў (1926—2005) — спявак (лірычны тэнар). Народны артыст БССР. З 1954-га саліст Беларускай філармоніі, у 1956—1974-м — Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

■ **3 верасня** з’явіўся на свет Барыс Іпалітавіч Райскі (1915—1993) — дырыжор. Заслужаны артыст БССР. Працаваў у Кемераве, Рызе, Іванаве, Львове. З 1957 года галоўны дырыжор аркестра Мінскага цырка. У 1961—1988-м галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё (з 1979-га — сімфанічны).

■ **3 верасня** 1948 года — дзень нараджэння спевака Уладзіміра Міхайлавіча Правалінскага, народнага артыста Беларусі, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

■ **5 верасня** з’явіўся на свет Пётр Максавіч Яўіч (1918—2008) — жывапісец. Удзельнік Вялікай Айчыннай, кавалер ордэна Айчыннай вайны II ступені. Жыў і працаваў у Віцебску.

Установа адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых работ або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меншы як 7 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Дацэнт кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых работ або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меншы як 7 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя і ступень магістра (вышэйшая адукацыя і навуковая кваліфікацыя “Даследчык”, вышэйшая адукацыя і вучоная ступень), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, не меншы як 3 гады, або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі “Кіраўнікі” або “Спецыялісты”, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя і ступень магістра (вышэйшая адукацыя і навуковая кваліфікацыя “Даследчык”, вышэйшая адукацыя і вучоная ступень), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, не меншы як 3 гады, або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі “Кіраўнікі” або “Спецыялісты”, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Прафесар кафедры скульптуры

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вучоная ступень доктара або кандыдата навук, наяўнасць навуковых работ або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меншы як 7 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Старшы выкладчык кафедры прамысловага дызайну і інтэр’ера

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя і ступень магістра (вышэйшая адукацыя і навуковая кваліфікацыя “Даследчык”, вышэйшая адукацыя і вучоная ступень), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, не меншы як 3 гады, або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі “Кіраўнікі” або “Спецыялісты”, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Старшы выкладчык кафедры прамысловага дызайну і інтэр’ера

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая адукацыя і ступень магістра (вышэйшая адукацыя і навуковая кваліфікацыя “Даследчык”, вышэйшая адукацыя і вучоная ступень), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, не меншы як 3 гады, або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах служачых, якія адносяцца да катэгорыі “Кіраўнікі” або “Спецыялісты”, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не меншы як 5 гадоў.

Тэрмін абрання па конкурсе — 5 гадоў.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання паведамлення.

Заявы і дакументы падаваць на імя рэктара БДАМ на адрас: **220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў**. Тэлефон: **8 017 3669341**.

Конкурс праводзіцца **29.10.2024** ва ўстанове адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”.

УНП 100289132

Афіша з 30 жніўня па 6 верасня

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Персанальная выстава **“Прастора святла і колеру: акварэль”** Яўгена Саковіча — члена Беларускага саюза мастакоў, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, уладальніка ордэна Кірылы Тураўскага Беларускай праваслаўнай царквы. **Да 2 верасня.**
• Выстава **“Выяўленчае мастацтва Мардовіі”**, арганізаваная пры ўдзеле Мардоўскага рэспубліканскага музея выяўленчых мастацтваў імя С. Д. Эрзі і Саюза мастакоў Рэспублікі Мардовія. **Да 29 верасня.**
• Выстава **“І ты закрасуеш, наш Мінск стрададўні”**. Аблічча горада на творах пачатку XX стагоддзя — 1968 года. **Да 6 кастрычніка.**
• Выстава **“Сімвалы, атрыбуты і алегорыі ў мастацтве Беларусі XVII–XIX стст”. Да 13 кастрычніка.**
• Выстава **“Плынь часу”**. Жывапісныя і скульптурныя творы беларускіх мастакоў — юбіляраў 2024 года. **Да 21 кастрычніка.**
• Экскурсіі: **“Самыя-самыя...” (6+), “Якога колеру зіма?” (6+), “Казкі Усходу” (10+), “Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма” (10+), “Партрэты даўніх мінулых пакаленняў...” (10+), “Пяць моў кахання” (16+), “Жаночы партрэт” (16+), “Мінск у музеі” (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100577771

МУЗЕЙ “ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ.”

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава жывапісу XX стагоддзя **“Мая Радзіма — Беларусь”** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея, прысвечаная 80-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **Да 5 верасня.**
• Праграма **“Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы”. Праводзіцца заўсёды.**
• Квэст **“Таямніцы старажытнай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Квэст **“Пошукі мінулага”. Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **“Інтэр’ер шляхецкай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **“Шлях мастака Валенція Ваньковіча”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **“Сядзібны партрэт”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100577771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца,
вул. Іванаўская, 176,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава **“Традыцыйная беларуская кераміка”**. Творы з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея і Івянецкага музея традыцыйнай культуры. **Да 27 кастрычніка.**
• **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **“Саломапляценне”**. **Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **“Лялька-мотанка”. Праводзіцца заўсёды.**
• Майстар-клас **“Ткацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100577771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Art-lectorium **“Эразумелае мастацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100577771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Музычная казка ў 1 дзеі **“Шматкі па закутках” (0+)**. **1 верасня ў 12.00.**
• Адкрыццё 137-га тэатральнага сезона. **“Сцэнічная калабарацыя даўжынёю ў жыццё” (12+).** 75-годдзю артыстаў Галіны Угначовай і Васіля Галеца прысвячаецца! **5 верасня ў 18.30.**
• Крымінальная камедыя **“Хітрыкі Скапена” (16+)**. Прэм’ера. **6 верасня ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Трагіфарс **Donna sola (“Жанчына адна”) (18+)**. Камерная сцэна. **2 верасня ў 19.00.**
• Імпрэза **“Музыка душы” (0+)**. Камінная зала. **2 верасня ў 19.00.**
• Спектакль **“Бясконцая гісторыя” (16+)**. Прэм’ера. Камерная сцэна. **3 верасня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **“Чакана гучна і да болю блізка” (16+)**. Камерная сцэна. **4 верасня ў 19.00.**
• Імпрэза **“Музыка душы. Роднае” (0+)**. Камінная зала. **5 верасня ў 19.00.**
• Спектакль **“Двор майго дзяцінства” (12+)**. Камерная сцэна. **6 верасня ў 19.00.**
• Канцэрт класікі рока ў цемры **“Вазьмі маё сэрца” (12+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца на вул. Валгаградскай, 35. **6 верасня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Канцэрт **“Шэдэўры оперы” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **4 верасня ў 19.30.**
• Опера ў 2 дзеях **“Царская нявеста” (12+)**. **8 верасня ў 18.00.**

УНП 191081322

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Святочная праграма да Дня народнага адзінства ў ваенна-гістарычным комплексе “Старая мяжа” (п. Станькава). 17 верасня, 13.00 — 17.00. Уваход вольны.**
• Часовая экспазіцыя **“Адзінай памяці верныя”**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.
• Часовая экспазіцыя **“Музей. Час. Памяць”**, створаная ў рамках праекта “Адкрытыя фонды”.
• Запрашаем паўдзельнічаць у творчым конкурсе **“Захоўваем і памятаем”**. Больш падрабязна — на афіцыйным сайце.
• У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне экспазіцыі музея.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.
УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “НЯСВІЖ”

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Культурнае мерапрыемства **“Тэатральная замалёўка”**. **31 жніўня. Пачатак у 12.00, 13.00, 14.00.**
• Тэатралізаваная экскурсія **“Таямніцы палацавых прыёмаў”. 31 жніўня з 13.00.**
• Тэатралізаваная экскурсія **“Тэатральны экспромт у Нясвіжскім замку”. 1 верасня з 13.00.**
• Часовая экспазіцыя **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”. Да 13 кастрычніка.**
• Выставачны праект **“Прыгажосць і мода. XIX–XXI стагоддзі”. Да 20 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **“Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені”**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Выстава **“Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі”**. Калекцыйныя залы “Слуцкія паясы”. **Да 31 снежня.**
• Міжнародны выставачны праект **“Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара”. У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **“Палацавыя таямніцы”**.
• Віртуальныя выставы: **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”, “Нясвіж — здабытак сусветнай культуры”, “Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа”, “Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»”**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Экспазіцыя твораў сучаснага мастака Маргарыты Маніс **“Мінск у Нясвіжы”. Да 9 кастрычніка.**

Архітэктурны помнік “Слуцкая брама” (г. Нясвіж, вул. Слуцкая)
• Часовая экспазіцыя **“Колер і святло. З гісторыі вітражнага мастацтва”** з фондаў музея-запаведніка. **Да 30 верасня.**

Пастаянныя экспазіцыі
• **“Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.”.**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **“Культура часу”**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **“Безаблічны артэфакт”, “Карта сямі каралеўстваў”, “Музейны дэтэктыў”, “Музейнае расследаванне”**.
• Культурныя мерапрыемствы: **“Прыём у княгіні”, “Дзень нараджэння ў ратушы”** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **“Школа шпіёнаў”** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **“Музейка аб музеі”** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **“Выкрунтасы”** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава работ з фонду НЦСМ **“Візуалізацыі. Паверхня і знак”. Да 5 верасня.**
• Выстава **“Лета — маленькае жыццё!”** з фондавых калекцый НЦСМ. **Да 5 верасня.**
• Выстава **“Жывыя, пакуль памятаем”**. Па выніках пленэру, прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **Да 29 верасня.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **“Слоўнікавы запас”. Да 6 кастрычніка.**

УНП 192543414

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Квэст **“Таямніца двух куфраў”. 7 верасня ў 15.30.**
• Касцюміраваная выстава **“Гісторыя ў асобах”** Цэнтральнага музея васковых фігур Санкт-Пецярбурга. **Да 30 верасня.**
• Экспазіцыя **“Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку”**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **“Інтрыгі Купідона”**.
• Сямейная квэст-экскурсія **“Легенды і паданні Мірскага замка”**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **“Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце”, “Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.”, “Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.”, “Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў”**.

УНП 590201541

Вялікі тэатр Беларусі
аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад
па творчай спецыяльнасці “Артыст хору”
па наступных тыпах галасоў:
бас, тэнар, сапрана і мецца-сапрана.
Дадатковая інфармацыя — на сайце **bolshoibelarus.by**.
220029, г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.
УНП 191081322

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года

Газета “Культура”

Індывідуальны	Ведамасны	Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску для сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў)
63875	**638752**	**63879**
1 мес. — 15,43 руб., 3 мес. — 46,29 руб.	1 мес. — 25,04 руб., 3 мес. — 75,12 руб.	1 мес. — 17,38 руб., 3 мес. — 52,14 руб.

Часопіс “Мастацтва”

Індывідуальны	Ведамасны	Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску для сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў)
74958	**749582**	**74986**
1 мес. — 20,84 руб., 3 мес. — 62,52 руб.	1 мес. — 40,84 руб., 3 мес. — 122,52 руб.	1 мес. — 22,97 руб., 3 мес. — 68,91 руб.

Газета “Культура” + часопіс “Мастацтва” (камплект)

Індывідуальны	Ведамасны
63874	**638742**
1 мес. — 33,02 руб., 3 мес. — 99,06 руб.	1 мес. — 59,76 руб., 3 мес. — 179,28 руб.

Падрабязней — на сайце kultura-info.by

t.me/kultinfa
Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад “Культуры”! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022
КУЛЬТУРА
Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАЎРЫШ, Данііл ШЭЙКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.

Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).

Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца.

Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на праспекце Незалежнасці, 44, 48, 98, на праспекце Пераможцаў, 5, на вуліцы Карла Маркса, 38, на вуліцы Кальварыйскай, 4а, у падземным пераходзе на плошчы Перамогі.

Падпісана ў друк 29.08.2024 у 16.00. Замова № 1773. Наклад 3320.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.